ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 30 (787) ● Чацвер, 29 кастрычніка 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII

*РЭКТАРУ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА ТАВ. СЕЎЧАНКУ А. Н.*
*САКРАТАРУ ПАРТКОМА ТАВ. ГАРБАЧОВУ М. К.*
*СТАРШЫНІ КАМІСІІ САДЗЕЙНІЧАННЯ ФОНДУ МІРУ ТАВ. САРОКА В. А.*

**Дарагія сябры!**

**Беларускі рэспубліканскі камітэт абароны міру сардэчна дзякуе калектыву універсітэта за актыўны удзел у пачэснай справе — барацьбе за мір.**

**Работа, якая праводзіцца вамі,—лекцыі, гутаркі, мітынгі пратэсту супраць агрэсіўных дзеянняў правячых колаў ЗША у Індакітаі і ізраільскіх экстрэмістаў на Блізкім Усходзе, матэрыяльная падтрымка савецкага фонду міру—усё гэта гаворыць аб вялікім укладзе у справу міру выкладчыкаў, студэнтаў, усіх работнікаў універсітэта.**

**Жадаем вам, дарагія таварышы, добрага здароўя, вялікіх поспехаў у вучобе, педагагічнай і навуковай дзейнасці.**

**Мы спадзяёмся, што ваш калектыў і надалей будзе актыўна удзельнічаць у руху за мір і папаўненні савецкага фонду міру.**

**Старшыня прэзідыума Беларускага рэспубліканскага камітэта абароны міру І. МЕЛЕЖ.**
**Адказны сакратар Т. АСЕНЕНКА.**

## ДЗЕНЬ ПАЛІТІНФАРМАЦЫІ

### *ЯК МЫ ЯГО ПРАВОДЗІМ*

Нямала прыйшлося памеркаваць, параіцца, падумаць партыйнаму бюро гістфака, перш чым з'явілася аднадушнае рашэнне вызначыць для правядзення палітінфармацый адзіны дзень для усяго факультэта — сераду.

Па дамоўленасці з дэканатам палітінфармацыі уведзены у расклад. Каб адвесці для іх патрэбны час, заняткі другой змены перавялі на час пазней. Такім чынам, у першую і трэцюю серады кожнага месяца у гэты час праводзяцца палітінфармацыі, а у другую і чацвёртую—арганізуюцца мерапрыемствы па планах куратараў: сходы, экскурсіі, сустрэчы і г. д.

Своеасаблівa склалася тэматыка. На яе аказалі уплыў рэкамендацыі парткома, партбюро і пажаданні студэнтаў, якія прапанавалі для абмеркавання цікавячыя іх пытанні.

І вось першыя такія дні на факультэце прайшлі вельмі цікава, сабралі масавую аўдыторыю. Так, у сераду мінулага тыдня самыя малодшыя, першакурснікі, слухалі расказ прафесара Л. С. Абецэдарскага аб асноўных этапах развіцця гістарычнага факультэта. Дэкан П. З. Савачкін гутарыў з другакурснікамі. Яны пазнаёміліся з тымі праблемамі, над якімі працуе прафесарска-выкладчыцкі састаў. На трэцім курсе сакратар партбюро Э. М. Загарульскі прысвяціў свае выступленне тэме «Сацыялістычныя абавязацельствы тваіх выкладчыкаў, студэнт». З праблематыкай навуковых даследаванняў выкладчыкаў факультэта пазнаёміў чацвёртакурснікаў дацэнт Д. Б. Мельцар. А выпускнікам была прапанавана лекцыя аб культуры паводзін маладога чалавека.

Уся другая змена, групы філосафаў і эканамістаў, праводзіла палітінфармацыі з 14 гадзін да 14.45 па тэме «Ленінскі запавет моладзі»—да 50-годдзя выступлення У. І. Леніна на III з'ездзе камсамола.

У наступную сераду ужо у першай змене адбыліся гутаркі па групах—«Ленінскі запавет моладзі», а у другой ішлі лекцыі і гутаркі па курсах. Прарэктар універсітэта С. А. Умрэйка расказаў другакурснікам аб БДУ напярэдадні 50-годдзя, на III курсе выступіў лектар таварыства «Веды» («Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і эканамічная палітыка КПСС»), чацвёртакурснікі праслухалі лекцыю прафесара І. М. Лушчыцкага «Ф. Энгельс і рэвалюцыйная Беларусь». На пятым курсе ішла гутарка аб этыцы моладзі.

Арганізаванасць, вялікая зацікаўленасць студэнтаў, іх добрыя водгукі сведчаць аб тым, што партыйнае бюро і дэканат факультэта знайшлі правільнае рашэнне.

**І. ЦАРУК,**
**дацэнт, член партбюро гістарычнага факультэта.**

## АЦЭНЕНА СТАНОЎЧА

**НА МІНУЛЫМ ТЫДНІ адбылася справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя супрацоўнікаў універсітэта.**

**Аб рабоце мясцовага камітэта БДУ за справаздачны перыяд расказаў яго старшыня А. А. Галаўко. Ён адзначыў асноўныя формы работы прафарганізацыі, расказаў аб праведзеных праверках, абагульненні вопыту, арганізацыі грамадскага агляду па культуры вытворчасці, правядзенні вечароў адпачынку, экскурсіі, спартыўных спаборніцтваў, заахвочванні лепшых актывістаў і г. д.**

**Шмат увагі удзяляў камітэт рабоце нізавых прафсаюзных бюро. Разглядаліся пытанні аб арганізацыі і матэрыяльным забеспячэнні вучэбнага працэсу на філфаку, аб рабоце бытавых камісій хімічнага, фізічнага і падрыхтоўчага факультэтаў па кантролю за работай буфетаў, аб палітыка-выхаваўчай рабоце у адміністрацыйнай частцы, аб дзейнасці прафбюро біяфака па падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў у гонар ленінскага юбілею. Практыкаваліся і сумесныя пасяджэнні мясцкома з прафкомам. Асаблівую увагу надаваў мясцком вучэбнаму і вытворчаму працэсам, паляпшэнню культурна-масавай і палітыка-выхаваўчай работы.**

**Дакладчык звярнуў увагу прысутных і на некаторыя недахопы. Адчуваліся спады у дзейнасці прафсаюзных арганізацый у перыяд экзаменацыйных сесіи, не заўсёды рэгулярна наладжваліся дзяжурствы асобных членаў мясцкома, часта затрымлівалася афармленне і давядзенне да выканання асобных дакументаў. Гаварылася аб слабай арганізацыі уліку і нясвоечасовым зборы членскіх узносаў на філалагічным факультэце. Прадстаўнікі гэтага факультэта нездавальняюча працавалі ва усіх камісіях мясцкома.**

**У спрэчках па дакладу выступілі тт. Кавалёў, Бухманаў, Барысенка, Рагоўскі, Некрашэвіч, Ждановіч, Валадзько. Яны прапанавалі больш увагі удзяляць пытанням рацыянальнага выкарыстання прыбораў, тэхнікі, а таксама пытанням працоўнай дысцыпліны, правільнага размеркавання пуцёвак у дамы адпачынку, санаторыі г. д.**

**Станоўча ацаніла дзейнасць прафарганізацыі БДУ і расказала аб задачах, якія стаяць перад калектывамі вну, старшыня Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў Я. Т. Смірнова.**

**На канферэнцыі быў выбран новы састаў мясцкома. У яго увайшлі В. Ф. Чыгір (старшыня), М. Д. Ціва (намеснік), А. С. Федэнка, В. А. Сарока, Н. Г. Юркевіч, Н. В. Мяцельскі, Н. С. Галіна, і. Т. Рагоўскі, Л. А. Паўловіч, А. В. Шыбаева, Д. Н. Саковіч, К. В. Сабіла, С. М. Грабчыкаў, М. М. Кучынскі, М. Д. Міхей, Ю. І. Драгун, А. Р. Улазава, В. С. Анохіна, Г. А. Драбушэвіч.**

**А. АЛЕКСАНДРОВІЧ.**

## МІНУСЫ НА ФОНЕ ПЛЮСАЎ

Першакурснік... Цяжка яму прывыкаць да студэнцкага бурлівага жыцця, няёмка, калі адстаеш ад сваіх сяброў хоць у чым-небудзь. Разам з тым прыемна, калі сябры даручаюць выканаць якое-небудзь заданне. Для Міхаіла Нікішына, студэнта І курса журфака, гэтым першым заданнем была падпіска на газеты і часопісы 1971 года. Крыху раней Мішу выбралі у склад бюро камітэта камсамола курса. І вось сур'ёзнае заданне: падпіска.

Пагутарыў з сакратаром камсамольскай арганізацыі Сашам Піталёвым, старастам Мікалаем Аксіневічам. Утраіх вырашылі сабраць групкамсоргаў. Ну, здаецца, усё у парадку. У першай групе падпіску весці узялася Тамара Анцуг, у другой—Валя Праскурава, у трэцяй—Тамара Субач. З першых дзён усе трое пачалі спаборніцтва.

Моладзі уласціва цяга да усяго новага. А дзе, як не у газетах і часопісах, хутчэй даведаешся аб гэтым новым? І вось па падпісных лістах з'явіліся першыя назвы. Міхаіл Нікішын выпісаў ажно чатыры выданні: газету «Правда», часопісы «Молодой коммунист», «Комсомольская жизнь», «Рабоче-крестьянский корреспондент», па тры перыядычныя выданні будуць атрымліваць Пётр Дзятліковіч, Таня Тарлецкая і многія іншыя. Тых, хто выпісаў два выданні, — большасць. Праглядаеш падпісныя лісты і заўважаеш, што юнакі і дзяўчаты больш за ўсё паважаюць старэйшыя маладзёжныя рэспубліканскія газеты «Чырвоную змену» і яе «сяброўку» «Знамя юности». У падпісных лістах значацца і «Литературная газета», і «Літаратура і мастацтва», і «Минская праўда», і «Вячэрні Мінск» і г. д.

Так, будучым журналістам патрэбна шмат чытаць, вучыцца майстэрству у сваіх старэйшых сяброў. Які ж будзе журналіст са студэнта, што не цікавіцца сённяшнім жыццём краіны, не імкнецца да ведаў? І усё ж, на жаль, такія таварышы на І курсе журфака ёсць. З-за іх на фоне плюсоў і стаіць мінус.

Трэцяя група першай на курсе закончыла падпісную кампанію. «26 чалавек у групе, а больш 45 перыядычных выданняў выпісалі»,—кажа М. Нікішын. Праз дзень-другі падпісныя лісты здадуць і Тамара Анцуг, і Валя Праскурава. Больш ста газет і часопісаў будуць атрымліваць першакурснікі журфака. Нядрэнна, але магло быць і больш.

І. СЦЯПУРА,
студэнт журфака.

## УДАСТОЕНЫ ЗАЛАТОГА МЕДАЛЯ

На кафедры ядзернай фізікі створан новы прыбор—квантавамеханічны лічыльнік фатонаў КМСФ-5. На працягу трох месяцаў над ім працавалі дацэнт Ю. Е. Селянінаў, кандыдат фізіка-матэматычных навук А. Н. Перцаў, старшы інжынер В. І. Насонаў, старшы навуковы супрацоўнік Э. І. Падольны, інжынер А. А. Шамецька. Кіраваў гэтым калектывам прафесар А. Н. Пісарэўскі.

У прыборы рэалізаван квазіадначасовы рэжым рэгістрацыі, што дазваляе забяспечыць максімальную адчувальнасць у спалучэнні з незалежнасцю вынікаў вымярэнняў ад дрэйфаў апаратуры.

Прыбор КМСФ-5 прызначан для аўтаномнага прымянення, а таксама у спалучэнні з рознымі аптычнымі (спектральнымі) прыборамі. Асноўная галіна прымянення — рэгістрацыя прэдзельна слабых светавых патокаў пры даследаванні фота-, бія-, радыёлюмінесцэнцыі, камбінацыйнага рассейвання і іншых працэсаў, суправаджаемых выхадам невялікай колькасці квантаў. Прыбор знайшоў прымяненне у медыцыне, хіміі, біялогіі.

КМСФ-5 з поспехам дэманстраваўся на рэспубліканскай юбілейнай выстаўцы тэхнічнай творчасці маладых, прысвечанай 50-годдзю камсамола Беларусі. А на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР у 1970 годзе атрымаў залаты медаль.

**Н. САЛУК.**





Па занятках па французскай мове ў студэнтаў другога курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта. Ля дошкі выкладчыца В. І. Урэнёва.

КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

# ПРАВЕРКА ПРАЦАЗДОЛЬНАСЦІ

Нягледзячы на асенні холад, апошнія кастрычніцкія тыдні былі асабліва гарачымі. На факультэтах адбываліся справаздачна-выбарныя сходы. Сакратары, члены камітэта камсамола падводзілі вынікі сваей дзейнасці. На працягу года шматграннае жыццё камсамольскай арганізацыі у многім залежала ад іх ініцыятывы.

У сваей справаздачы сакратар камсамольскай арганізацыі хімічнага факультэта А. Волкау не аналізавау работу камітэта камсамола, а толькі праінфармавау аб асноуных яе напрамках. Дакладчык адзначыу павышаную актывізацыю камсамольцау у час Ленінскага заліку. У гэты перыяд камсамольскія даручэнні узялі амаль утрая больш студэнтау, чым раней. Павялічыуся працэнт паспяховасці у зімнюю сесію. Але па невядомай прычыне у вясеннюю сесію у многіх групах справа рэзка пагоршылася. Відаць, дзейнасць камітэта камсамола абмежавалася стварэннем акадэмкамісіі, якая не змагла замацаваць накоплены вопыт работы з адстаючымі студэнтамі.

Шмат паездак зрабілі камсамольцы хімічнага факультэта у падшэфныя калгасы і школы. Многа карысных спрау было зроблена культмасавым сектарам. На факультэце арганізавалі інструментальны ансамбль, хор, агітбрыгаду. А вось работа спартыунага сектара павінна быць лепшай. У многіх спаборніцтвах студэнты хімфака выглядалі значна слабей, чым у мінулыя гады. Больш сур'ёзна трэба аднесціся камсамольцам хімфака і да дзейнасці СНТ.

**Г. НАУМЧЫК.**



На здымку: вучні 1-й Мінскай школы аоменьваюцца значкамі з гасцямі-студэнтамі падрыхтоучага факультэта.

Фота М. Нечыпарэнкі.

# ПАДРАХУНАК МІНУЛАГА ГОДА

Няважна ішлі справы у мінулым годзе у камсамольцау геаграфічнага факультэта. У сваёй справаздачы сакратар камітэта камсамола факультэта В. Абакшонак гаварыу аб гэтым адкрыта і рэзка:

— У нас пастаянна узмацняецца раздзяленне студэнтау на актыуных і пасіуных. Не усе адказныя за сектары спрауляюцца са сваімі абавязкамі, няма у нас і канкрэтнага планавання работы...

Прыкладау хапае. Толькі каля пятай часткі усіх камсамольцау маюць больш ці менш пастаянныя даручэнні. Ні на адно з пятнаццаці пасяджэнняу камітэт не сабрауся у поуным складзе, з 24 чалавек прысутнічала не больш 16.

Факультэцкая газета «Мерыдыян» выпускаецца без дакладнай перыядычнасці, афармляецца неахайна. За увесь мінулы год было зроблена толькі пяць нумароу, а у новым навучальным годзе за газету яшчэ не браліся. Гэта папрокі у адрас З. Васільевай, узначальваючай сектар насценнага друку. Ніводнага нумара «Камсамольскага пражэктара» не выпусцілі за год Палятаеу і Нямытау.

А як абстаяць справы у іншых сектарах? Не лепш.

Акадэмічны сектар. Прагулы, пропускі занятkау—вось самая злосная хвароба студэнтау геафака. У гэтых адносінах факультэт аказауся «чэмпіёнам» ва універсітэце. Лічба проста-такі астранамічная: за год прапушчана 24.258 гадзін. На факультэце склалася група пастаянных прагульшчыкау: Бычкоуская, Бабкоу, Волкава, Грышына, Гурко, Петрычэнка і іншыя.

Нічога пакуль што не змянілася і у гэтым годзе. Нядауна была праведзена праверка на III курсе у час апошняй лекцыі. Адсутнічала 36 чалавек, сярод іх старасты і члены бюро.

А як вынік—нізкая паспяховасць. Самая большая колькасць нездавальняючых адзнак за мінулы год—па матэматыцы, хіміі, гісторыі КПСС. Толькі на першым курсе 35 чалавек умудрыліся атрымаць па матэматыцы нездавальняюча.

А між тым у мінулым годзе былі створаны добрыя умовы для вучобы: павялічылася колькасць аудыторый і кабінетау, заняткі ідуць у адну змену. Прыемна адзначыць, што ёсць на факультэце студэнты, якія і сесію здаюць на добра і выдатна, і грамадскай работай займаюцца. Гэта студэнты Голубеу, Новікава, Слабодская, Патацейка, Пірожнік, Гвардзіна і іншыя. Дзякуючы такім студэнтам факультэт па выніках вясенняй сесіі юбілейнага года аказауся на трэцім месцы ва універсітэце.

Вядзецца на геафаку і навуковая работа. Па розных тэмах было выканана 19 даследаванняу. Аднак займаецца у гуртках яшчэ вельмі мала студэнтау. Асноуная маса быццам не ведае аб іх існаванні і нават не цікавіцца справамі таварышау. Так, на апошнюю навуковую канферэнцыю з усяго факультэта з'явілася толькі 60 чалавек.

А аб органе навуковага сектара і савета СНТ «Исследователь» можна сказаць тое ж, што і аб «Мерыдыяне».

Добрых спартыуных поспехау дабіваліся некалі на геаграфічным факультэце. У мінулым жа годзе згубілі і тое, што было, запяушы ва універсітэцкай спартакіядзе амаль апошняе месца. Не радуюць і паказчыкі агульнауніверсітэцкіх кросау. Зноу жа галоуная прычына няудач — пасіунасць. Зімой вырашылі на факультэце правесці спаборніцтвы лыжнікау. Вынікі былі «цікавымі»: з другога курса з'явілася тры чалавекі, з трэцяга — шэсць, з чацвёртага—два, з пятага—дзесяць. На вясенні крос з'явілася толькі 70 студэнтау.

Аднак, гаворачы аб гэтых фактах, не трэба забываць і пра тое добрае, што рабілася на факультэце. Рыхтаваліся вечары, факультэцкая агітбрыгада не аднойчы выступала у падшэфных калгасах Стаубцоускага, Баранавіцкага і Хоцімскага раёнау.

Нядрэнных вынікау дабіліся студэнты за месяц сельскагаспадарчых работ. Сабрана 3.788 тон бульбы, ачышчана 655 тон зерня і г. д. Але і гэта зусім не гаворыць аб тым, што на полі пабывалі усе. Калі з першага курса працавала 126 чалавек, дык з чацвёртага— 76. Чым вышэй курсам, тым «лепш».

На працягу трох год быу сакратаром камсамольскай арганізацыі курса А. Серафімовіч. У спрэчках ён усхвалявана гаварыу:

— Мы часта бываем фармалістамі, любім падаваць лічбы і даныя. На кожным сходзе гаворым аб недахопах, але вось прайшоу год, другі, а мы зноу і зноу адзначаем тыя ж самыя упушчэнні.

— Камсамольская работа перш за усё ідэалагічная. А у нас яна пастаулена дрэнна,—сказау студэнт І. Сцяпура.

Сакратар камітэта камсамола універсітэта В. Пракошын адзначыу:

— Мы аказвалі недастатковую дапамогу студэнтам геаграфічнага факультэта, але не было такога выпадку, каб за ёй звярталіся...

Здаецца, выказалі усё набалеушае. Ну, а новаму камітэту было што пажадаць.

**В. ЖУК.**

*У ДАПАМОГУ ЛЕКТАРУ І ПАЛІТІНФАРМАТАРУ*

# ФРЫДРЫХ ЭНГЕЛЬС І РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ БЕЛАРУСЬ

Вядома, што К. Маркс і Ф. Энгельс з самага пачатку сваёй навуковай і рэвалюцыйнай дзейнасці многа цікавіліся Расіяй і яе народамі. Яны першыя з пазіцый гістарычнага матэрыялізму далі характарыстыку, ацэнку рускага, украінскага і беларускага народау, вызначылі іх ролю у сусветным грамадскім і палітычным развіцці. Гэта стала магчымым толькі пасля глыбокага і усебаковага вывучэння гісторыі, эканомікі, культуры, грамадска-палітычнай і філасофскай думкі нашай шматнацыянальнай краіны. «...Я не ведаю нікога, — пісау пра свайго вялікага друга К. Маркса Ф. Энгельс, — хто б так добра, як ён, ведау Расію, яе унутранае і знешняе становішча». Сам ён для таго, каб знаёміцца з гісторыяй і сучаснасцю вялікай дзяржавы з першакрыніц, пачау вывучаць рускую мову яшчэ у 1852 годзе.

У сувязі з надыходам рэвалюцыі у Расіі і К. Маркс і Ф. Энгельс прааналізавалі рэвалюцыйныя мажлівасці такіх буйных краін Еуропы, як Францыя, Германія і іншыя, і прыйшлі да сцверджання, што ніводная з іх пачаць рэвалюцыю не зможа. Што ж да Расіі, то, паводле слоу Ф. Энгельса, сказаных яшчэ у кастрычніку 1858 года, гісторыя у ёй ідзе вельмі добра.

Гэты вывад не пахіснула нават няудача паустання 1863 года у Польшчы, Літве і Беларусі. Наадварот, аналіз прычын няудачы памог правадырам сусветнага пралетарыяту зрабіць правільныя прагнозы на шмат гадоу наперад. У лісце свайму таварышу Ф. Зорге ад 27 верасня 1877 года К. Маркс адзначае, што Расія «дауно ужо стаіць на парозе перавароту... Рэвалюцыя пачнецца гэты раз на Усходзе, які быу дагэтуль некранутай цытадэллю і рэзервовай арміяй контррэвалюцыі». Два гады раней такую ж думку выказвау Ф. Энгельс у лісце А. Бебелю: «Сапрауды здаецца, што на гэты раз Расія першая пойдзе у скокі».

Такіх выказванняу можна прыгадаць шмат. Разам з К. Марксам Ф. Энгельс дзесяцігоддзямі вучыу пралетарыят Заходняй Еуропы дбаць пра падтрымку рускай рэвалюцыі, якая будзе мець сусветна-гістарычнае значэнне. Разам з К. Марксам Ф. Энгельс таксама цэлыя дзесяцігоддзі памагау рускім, беларускім і іншым рэвалюцыянерам Расіі змагацца з самадзяржауем, ісці найкарацейшым шляхам да пераможнага штурму старога ладу.

У шэрагу артыкулау Ф. Энгельса пад агульнай назвою «Якая справа рабочаму класу да Польшчы?», напісаных у пачатку 1866 года паводле просьбы К. Маркса і ухваленых ім, ёсць не толькі прызнанне беларускай нацыі, але і дадзена характарыстыка яе мовы, этнічных асаблівасцяу. «Далей, на поудні і на усходзе цяперашняга Царства Польскага, знаходзіліся **беларусы**, якія гавораць на мове сярэдняй між польскай і рускай, але больш блізкай да апошняй...». Сцвярджэнне блізкасці рускай і беларускай нацый і іх моу мела і мае прынцыповы палітычны і метадалагічны характар. Яно сваім адным вастрыём было скіравана супраць вялікадзяржауных рускіх шавіністау, а другім—супраць польскіх нацыяналістау, рэакцыйных сіл шляхты і каталіцкай царквы.

Ф. Энгельс у поунай згодзе з К. Марксам адзначыу, што далучэнне Беларусі і Украіны да Расіі было прагрэсіуным крокам у іх эканамічным і культурным развіцці. І справа тут не толькі у роднасці братніх народау, збліжэнне якіх, нягледзячы на русіфікатарска-каланізатарскую палітыку царызму, садзейнічала узаемаузбагачэнню іх культур. Немалое значэнне мела і тое, што Расія успрыняла куды больш элементау асветы і асабліва элементау прамысловасці, чым Польшча.

Польскае паустанне, як і меркавалі класікі марксізма, было адной з прычын, якія наблізілі паустанне на Беларусі і у Літве. Іх час амаль супау — польскае паустанне пачалося 22 студзеня 1863 года, а паустанне у большасці месц Літвы і Беларусі — у лютым — красавіку 1863 года. Як і прадбачыу Ф. Энгельс, на тэрыторыі Беларусі і Літвы яно набыло дэмакратычны, сапрауды масавы характар. К. Каліноускі і яго паплечнікі змаглі аб'яднаць пад рэвалюцыйна - дэмакратычным сцягам дзесяткі тысяч сялян, збяднелых шляхціцау-беларусау, палякау, рускіх, літоуцау для барацьбы супраць агульнага ворага — самаўладства і абшарнікау.

Успомнім далей, як асцярожна Ф. Энгельс падыходзіу да беларускага, украінскага і літоускага пытанняу. Ён лічыу, што права рашаць гэтыя пытанні належыць самім народам, якія вырашаць іх правільна. Падзеі паказалі, што беларусы, напрыклад, як гэта бліскуча даказау у сваіх друкаваных і вусных выступленнях Кастусь Каліноускі, беспаваротна зрабілі выбар ісці рэвалюцыйным шляхам.

З некаторых выказванняу К. Маркса і Ф. Энгельса выразна відаць, што яны спецыяльна цікавіліся эканомікай, культурай, бытам беларусау і добра ведалі многія галіны жыцця нашага народу. Так, напрыклад, Ф. Энгельс, усебакова аналізуючы пытанне аб сучасным і будучым зямельнай абшчыны у Расіі, асобна вылучае Гродзенскую губерню, дзе сяляне вякамі не мелі абшчыннай уласнасці. Зусім дапушчальна, што шырокую інфармацыю пра Беларусь і беларускі народ К. Маркс і Ф. Энгельс маглі атрымаць ад нашых землякоу П. Лаурова, М. Судзілоускага, В. Урублеускага, І. Гурвіча і іншых. Матэрыялы з Беларусі сістэматычна друкаваліся у лаурысцкім «Вперед» (поуны камплект якога быу у К. Маркса), у «Колоколе», у перыядычных выданнях эмігранцкай арганізацыі «Люд польскі».

Менавіта добрая інфармаванасць дазволіла Ф. Энгельсу даць высокую ацэнку беларускаму народу. Яна ёсць у шэрагу прац і пісем, прысвечаных паустанню 1863 года.

У першую чаргу Ф. Энгельс адзначае свабадалюбнасць беларусау, непрымірымасць іх да нацыянальнага або сацыяльнага прыгнёту. Адметнай рысай беларусау Ф. Энгельс лічыць іх інтэрнацыяналізм, цікавасць да сацыяльных праблем жыцця. Высока цэніць ён і масавы гераізм беларускага народу. 8 красавіка 1863 года Ф. Энгельс звяртае увагу К. Маркса на тое, што «літоускі рух (гаворка ідзе пра паустанне на Беларусі і у Літве; наогул Энгельс часта ужывау старую назву Беларусі і Літвы — «Літва». — **І.Л.,М.І.)** цяпер самы важны, бо ён: 1) выходзіць за межы кангрэсавай Польшчы, і 2) у ім прымаюць вялікі удзел сяляне, а бліжэй да Курляндыі ён набывае нават проста аграрны характар». Ф. Энгельс настолькі надавау вялікае значэнне паустанню у Беларусі і Літве, што лічыу яго умовай поспеху усяго руху. «Калі гэты рух не будзе спрыяльна развівацца і не ажывіць зноу руху у Каралеустве, — дадавау ён у тым жа лісце да К. Маркса, — то я не думаю, каб былі вялікія шансы на поспех». З другога боку, Ф. Энгельс разглядау паустанне як пацверджанне яго слоу і слоу К. Маркса пра тое, што рэвалюцыя у Польшчы паслужыць штуршком да рэвалюцыйнага выбуху у Расіі, гэта значыць, што гэтыя рэвалюцыі узаемна абумоуліваюць адна адну.

З выказванняу Ф. Энгельса лагічна вынікае высокая ацэнка, якую ён давау кіраунікам паустання у Беларусі і Літве. Ён адзначау, наколькі глыбока разумелі кіраунікі паустання і камандзіры атрадау сацыяльна-палітычныя задачы руху, яго інтэрнацыянальны характар і абавязак, уменне выбраць найбольш адпаведную умовам тактыку, у прыватнасці тактыку партызанскай барацьбы, у выпрацоуку якой найбольшы уклад зрабілі С. Серакоускі, К. Каліноускі, В. Урублеускі. Ф. Энгельс, несумненна, і хутчэй за усё паводле расказау В. Урублеускага, усё ведау пра беларускага рэвалюцыянера-дэмакрата, аднаго са славутых кіраунікоу паустання у Беларусі і Літве Кастуся Каліноускага. Многія словы Энгельса пра Валерыя Урублеускага як пра буйнага таленавітага камандзіра беларускіх паустанцау вельмі стасуюцца і да Каліноускага.

Пазней, аналізуючы прычыны няудачы паустання, Ф. Энгельс, як і К. Маркс, прыйшоу да высновы, што польскі нацыянальны урад, які баяуся сялянскай рэвалюцыі, не мог мець падтрымкі у шырокіх масах працоуных, што Польшча не зможа заваяваць сваю нацыянальную незалежнасць пад шляхецка-буржуазным кірауніцтвам, без падтрымкі вызваленчага руху у Расіі. Аднак, на іх думку, урок не прапау марна. Ён быу карысным не толькі палякам, беларусам, літоуцам і рускім, але і іншым народам. Расія стаіць на парозе вялікіх пераваротау. І у гэтых пераваротах гістарычную ролю, на думку Ф. Энгельса, адыграе і беларуская нацыя, якая паказала сваю

*Артыкул даецца у скарачэнні. Поунасцю ён будзе надрукаваны у лістападаускім нумары часопіса «Полымя».*

# ТВОРЧЫ ПОЎДЗЕНЬ КУПАЛАЎЦАЎ

*Міровіч, Платонау, Глебау, Рахленка, Стома. Ржэцкая... Бачыш гэтыя імёны у газетных і часопісных артыкулах, чуеш аб іх па радыё—і заусёды перад вачыма паустае творчы калектыу Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Паустае тая шматгранная галерэя вобразау, створаных майстрамі сцэны. Тут і Глебау у ролях Туляґі з камедыі «Хто смяецца апошнім», Сцяпана Крыніцкага з камедыі «Паулінка», Рахленка у ролі Гарлахвацкага ў камедыі «Хто смяецца апошнім» і Стома у ролях Пустарэвіча з той жа купалаускай «Паулінкі» і Лявона з камедыі А. Макаёнка «Лявоніха на арбіце».*

*І незалежна ад часу, ад тых абставін, у якіх ствараліся вобразы, яны жывуць і зараз на сцэне, у чалавечых сэрцах.*

*Мінула 50 год з дня стварэння Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, 50 год творчых пошукау. цяжкага і разам з тым пачэснага шляху.*

*Поудзень веку! З якім разнастайным рэпертуарам падышлі да свайго юбілею купалауцы! Такія спектаклі, як «Паулінка» Купалы, «Хто смяецца апошнім» Крапівы, «Лявоніха на арбіце» Макаёнка, «Традыцыйны збор» Розава, «Людзі на балоце» І. Мележа і многія, многія іншыя назаусёды запомніліся гледачу не толькі цікавым зместам, але, бадай, у большай ступені выключным выканаучым майстэрствам, сапрауды творчым натхненнем купалауцау.*

*«Паулінка»... У кожным новым сезоне глядач хвалюецца разам з гераіняй, перажывае за яе і пасля заканчэння спектакля доуга-доуга апладзіруе ёй, падносіць кветкі за тое уменне зачараваць, прымусіць гледача на працягу усяго спектакля жыць разам з акцёрамі адным дыханнем, адным рытмам. І нездарма «Паулінка» амаль што з першага дня існавання беларускага тэатра ні на адзін год не сыходзіла са сцэны. Гэтым жа спектаклем, жамчужынай беларускага сцэнічнага мастацтва, пачынауся у купалауцау сезон і гэтага, юбілейнага года. Прауда, не бачылі мы на сцэне ужо ні Глебава, ні Платонава, ні многіх іншых вядомых акцёрай беларускага тэатра. Але гэта не значыць, што спектакль страціу сваю ранейшую папулярнасць. Не! Кожны дзень, кожны новы сезон пацвярджаюць, што цікавасць гледача не паніжаецца, а, наадварот, узрастае. Гэта радуе і самых акцёрау, радуе тых, хто калісьці працавау разам з Глебавым, Платонавым. Эстафета майстэрства пачынальнікау тэатра перададзена у надзейныя рукі.*

*Дык шчаслівага шляху вам, купалауцы, новых творчых пошукау і здзяйсненняу.*

*У. ЛАЙКОЎ,*
*студэнт І курса беларускага аддзялення філфака.*





# ІХ ЯДНАЕ ПЕСНЯ

Ці варта пачынаць размову аб тым, любім мы спяваць ці не. Бясспрэчна — любім. Чалавек спявае заусёды, усюды і незалежна ад таго, які у яго голас: тэнар, альт або проста... дрэнны. Мы любім спяваць.

Ва універсітэце ужо больш двух дзесяцігоддзяу ведаюць і паважаюць харавую капэлу. Многа часу прайшло з той пары, калі першыя аматары харавых спевау сабраліся разам. Ветэраны дауно ужо закончылі універсітэт, выйшлі з яго сцен і наступныя пакаленні харыстау, але усе яны — фізікі, хімікі, матэматыкі, географы—з прыемным хваляваннем успамінаюць рэпетыцыі і канцэрты. Капэла існуе дауно, але не будзе памылковым выказванне, што гэты калектыу заусёды быу і застаецца маладым. З кожным годам на змену адным выканауцам прыходзяць другія — людзі розных імкненняу і інтарэсау. У капэле іх зближае песня.

Кіруе калектывам хормайстар і яе натхняльнік Юрый Францавіч Шутовіч. Гэты малады, энергічны чалавек, здаецца, жыве мелодыяй кожнай песні, якую выконваюць яго выхаванцы. Цяпер калектыу спевакоу захоплен работай, капэла у творчым пошуку.

З пачатку навучальнага года спевакі не далічыліся многіх сваіх калег, якія закончылі універсітэт. На іх месцы прыходзяць усе новыя і новыя студэнты — аматары песні. Усіх патрэбна выслухаць, далучыць да работы, а наперадзе ужо новыя заяукі, канцэрты, паездкі.

Мінулы навучальны год для студэнтаухарыстау быу насычан падзеямі. Яны пабывалі у гасцях у студэнтау Кіеускага дзяржаунага універсітэта імя Т. Шаучэнкі. Выступілі з канцэртамі. Гэту паездку добра запомнілі ветэраны капэлы, студэнты V курса фізічнага факультэта Міхаіл Фірман, Алег Ерашэнка, пяцікурсніца з хімфака Галіна Сарокіна. Асабліва спадабалася украінскім сябрам песня на словы Тараса Шаучэнкі «Реве та стогне Дніпр широкі». Капэла выконвала яе на украінскай мове.

Не толькі сардэчны прыём на канцэртах і пры сустрэчах застауся у памяці харыстау. Студэнтка IV курса гістарычнага факультэта Надзея Ермаковіч з захапленнем успамінае і Днепр, і Сафіяскі сабор і Кіева-Пячэрскую лауру — вядомыя помнікі старажытнасці.

Добра ведаюць народную харавую капэлу універсітэта студэнты, рабочыя і калгаснікі Гомельшчыны. Некалькі канцэртау перад рознай аудыторыяй сталі яркай прапагандай народнай песні.

А зусім нядауна хлопцы і дзяучаты з капэлы прымалі гасцей. На сцэне актавай залы універсітэта гаспадарылі спевакі з Карэліі. Студэнты Петразаводскага дзяржаунага універсітэта прывезлі мчога народных нацыянальных песень, выконвалі песні народау СССР. У студзені народная харавая капэла з адказным канцэртам паедзе у Петразаводск. Гэта у будучым, а пакуль — рэпетыцыі і рэпетыцыі.

Амаль кожны вечар у адной з аудыторый геаграфічнага корпуса збіраюцца члены гэтага невялікага працавітага калектыву. У іх рэпертуары беларускія народныя песні, такія, як «Ці свет, ці світае», латышская народная песня «Вей, вецярок», песня французскага кампазітара XVI стагоддзя П'ера Сертона «Тайна» і многія іншыя.

Разнастайны канцэртны рэпертуар. Але галоуная мэта, па словах Юрыя Францавіча, не колькасць канцэртау. На першым плане развіццё музыкальнай культуры, любві да песні. А канцэрты — гэта толькі справаздача аб праведзенай рабоце, гэта стымул для выканауцау, патрабаванне спяваць лепш.

На базе універсітэцкіх мастацкіх калектывау працуе факультэт грамадскіх прафесій. Перад слухачамі з лекцыямі выступаюць студэнты кансерваторыі. Праслухаўшы спецыяльны курс, харысты атрымліваюць неабходныя хормайстаоскія веды і самі змогуць стаць кірауніkамі самадзейных харавых калектывау, што, вядома, вельмі спатрэбіцца ім на месцы будучай работы.

На розных факультэтах вучацца удзельнікі харавой капэлы. Днём яны у аудыторыях слухаюць лекцыі, праводзяць хімічныя і фізічныя эксперыменты у лабараторыях, а вечарам усе збіраюцца разам. Чацвёрты год вучыцца ва універсітэце гісторык Надзя Ермаковіч, трэці — матэматык Галіна Морская, чацвёрты — хімік Галя Рылько, столькі ж год яны нязменныя салісты харавой капэлы.





Кароткія асеннія вечары. Як толькі пачынае цямнець, запальваюцца агні у вялікіх вокнах аудыторый. Юрый Францавіч Шутовіч падыходзіць да піяніна. Дзесяткі пар вачэй уважліва сочаць за яго энергічнымі рухамі. Спачатку гучыць патрэбная танальнасць чарговай песні, пасля узмах рукі і... «Однозвучно гремит колокольчик...» — пачынаюць звонкія галасы дзяучат. Апошняе слова спяваецца працяжна і плаўна, і тут падхопліваюць другія галасы — «...И дорога пылится слегка...».

Мелодыя запауняе аудыторыю і вырываецца за яе межы.

**І. КАШАРОЎСКІ.**

# ПРЫГАЕДЗЬЦЕСЯ ДА СЯБЕ

**Ці можна уявіць Таццяну Ларыну з цыгарэтай! (Пытанне было зададзена студэнтамі Груздзевым і Шыханцовым у 29 нумары «Беларускага універсітэта»). А ці можаце вы уявіць сабе любы кінафільм выпуску апошніх гадоу—не мае значэння, айчынны ці замежны,—дзе б жанчыны розных узростау не курылі? І не толькі адмоуныя гераіні.**

**Джульета—у штанах... А мы уважліва сочым за модай. І часопісы мод самых розных краін і рэспублік прапануюць нам штаны, штаны і толькі штаны. Гэта і паусядзённае адзенне, і вячэрняе убранства.**

**Наташа Растова з бутэлькай віна... А ці не нашы хлопцы за кожным святочным сталом гавораць: «Ну, выпі ж! Чаго ломішся!» А то яшчэ і горш.**

**Мы не збіраемся абвінавачваць ні кінематограф, ні заканадауцау мод, ні нават хлопцау, дзеля якіх гэта якраз і робіцца многімі з дзяучат. Не у гэтым справа. А у тым, што часта яшчэ не умеюць дзяучаты знайсці у сабе сваіх індывідуальнасцей, магчыма самых маленькіх рысачак, якія пры умелым іх выяуленні зробяць дзяучыну самай прыгожай, самай прывабнай. І вось вынік: мода міні— і у дзяучат міні-міні, мода максі — і у дзяучат максі-максі. А у новым фільме гераіня прыгожа курыць— і наша дзяучына раскрывае сумачку і дастае цыгарэту. Спачатку на вечарынцы, потым у патаемным куточку. Ужо звычка.**

**У некаторых з нас кураць мамы. Але ж яны— пакаленне, якое вынесла вайну. Яны—пакаленне, якое змагалася у партызанскіх атрадах, якое перанесла блакаду. Калі не было чаго есці, хлопцы працягвалі ім махорку. А нашы хлопцы прапануюць нам «ВТ», калі мы адзначаем за сталом свята.**

**Ці не наша віна, што прывучылі мы іх да гэтага! Непавагай да саміх сябе, сляпой пагоняй за модай, проста тым, што не падумалі: «Не такія, як усе, ім дзяучаты падабаюцца». Кожны хоча адшукаць сваю, непаўторную. А ён бачыць, што ты—«як і усе», і прапануе табе сам закурыць. А потым скажа, што ты—«выпадковы эпізод у яго жыцці».**

**Вось і здараецца, што жаданне выглядаць сучаснай, спадабацца абернецца бядой.**

**Але ж сучаснасць не у гэтым, дзяучаты. Ці не лепш выдзяляцца вясёлым характарам, чым новым сортам цыгарэт! Ці не лепш быць проста і элегантна апранутай! Дарэчы, элегантнасць ніколі не выйдзе з моды, а вось штаны — выйдуць.**

**Мы не ханжы. Мы не прапануем чадру і не патрабуем катэгарычнай забароны курэння. Але перш, чым закурыць, спыніцеся, дзяучаты, задумайцеся: «А ці варта гэта рабіць!»**

**Прыгледзьцеся да сябе, дзяучаты!**

**Н. КАЧКАР, А. ШАРОВА, Г. ПЛІГАЎКА, студэнткі.**

**ПРАЦЯГВАЕМ РАЗМОВУ**

# ГЭТА НЕПРЫЕМНА

*На днях мне давялося прачытаць у шматтыражцы артыкул Сёмінай «Аб прыгажосці, жаноцтве, модзе».*

*Па-першае, я вельмі удзячны тым таварышам, якія узнялі гэтае пытанне. Як дауно хацелася па-шчыраму выгаварыцца! Балючае месца у мяне, як і у многіх,—курэнне дзяучат. Сапрауды, якая недарэчнасць! На мой погляд, дзяучына ці жанчына—гэта тая пяшчотнасць, якая дадзена самой прыродай. Яна павінна быць узорам для кожнага чалавека. Даруйце, а якім узорам можа быць дзяучына, калі ад яе нясе нікацінам! Гэта непрыемна, прама кажучы, агідна. А некаторыя яшчэ крыудзяцца на свой дзявочы лес: не бяруць замуж. Ды які паважаючы сябе хлопец будзе нават сябраваць з такім гора-курцом?..*

*Я заклікаю усіх хлопцау весці самую жорсткую барацьбу з тымі дзяучатамі, якія кураць.*

*І. СЦЯПУРА,*
*студэнт IV курса геаграфічнага факультэта.*

Рэдактар
**А. А. НІКОЛЕНКА.**

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоуны корпус, п. 106. Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Зак. 1387. АТ 22426